Кавказе и в Средней Азии. Административное деление белорусского региона, в этой связи, представляется одним из механизмов проведения данной политики, но и как показатель результативности действий по имперской унификации региона.

**Литература**

1. Рибер, А. Изучая империи А. Рибер // Исторические записки. – М.: Наука, – 2003. – Т. 4. – С. 86-131.

2. Данилов, Е. С. Административная политика российского государства в первой по половине XIX века / Е. С. Данилов // Вестник ЮУрГУ, 2006. – №5. – с.24-28.

3. Андерсон, Б. Воображаемые сообщества. Размышления об истоках и распространении национализма / Б. Андерсон. – Пер. с англ. В. Николаева; Вступ. ст. С. Баньковской. – М.: «КАНОН-пресс-Ц», «Кучково поле», 2001. – 288 с.; Бурдье, П. Идентичность и репрезентация: элементы критической рефлексии идеи «региона» / П. Бурдье // Ab Imperio. – 2002. – № 3. – С. 52.

4. . Хрох, М. Ориентация в типологии / М. Хрох // Ab Imperio. – 2000. – № 2. – С. 15.

5. Мацузато, К. Генерал-губернаторства в Российской империи: от этнического к пространственному подходу / К. Мацузато // Новая имперская история постсоветского пространства. – Казань, 2004. – С. 427-458.

6. Анішчанка, Я. К. Генеральнае межаванне на Беларусі / Я. К. Анішчанка. – Мінск: Беларус. навука, 1996. – 166 с.

7. Буткевич, Т. И. Устройство и управление Римско-католической Церкви вообще и в России в частности / Т. И. Буткевич. – Харьков, 1916. – С. 552; Чихачев, Д. Н. Вопрос о располячении костела в прошлом и настоящем / Д. Н. Чихачев. – СПб., 1913. – С. 19.

8. Именной Высочайший Указ 14 марта 1911 г. – О распространении действия Положения о земских учреждениях на Витебскую, Волынскую, Киевскую, Минскую, Могилевскую и Подольскую губернии // Свод Законов Российской Империи: В 5-ти кн., XVI-ти т. / Под ред. И. Д. Болтухай-Мордовского, сост. Н. П. Балканов, С. С. Войт, В. Э. Гинцбург. – СПб.: Деятель, 1912-1914. – Кн. 1, Т. II: Свод губернских учреждений. – 1912. – С. 251-255.

9. Миронов, Б. Н. Социальная история России периода империи (XVIII-начало XX в.): Генезис личности, демократической семьи, гражданского общества и правового государства / Б. Н. Миронов. – В 2 т. – СПб.: Изд. Дм. Буланин, 1999. – Т. 1. – С. 30.

## СТАН БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

***Янкоўская В.С., 2 курс, гістарычны факультэт, БДПУ, Мінск***
***навук. кір. – Забаўскі М.М., доктар гістарычных навук, прафесар, БДПУ***

Пасля паўстання 1863 - 1864 гг. царызм пачаў ажыццяўляць рэформы на беларускіх землях. Хоць правядзены рэформы былі са значным спазненнем, але яны далі новы штуршок да развіцця капіталістычных адносін. Гэтыя змены садзейнічалі развіццю друкавання, адукацыі і асветы. Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца вызначэнне праблем развіцця і стану беларускага кнігадрукавання ў другой палове XIX - пачатку XX ст. Даследаванні ў гэтай галіне праводзілі такія навукоўцы як С.Х. Александровіч, Н.Ю Бярозкіна, А.А. Воўк, Л.І. Доўнар, М.М. Забаўскі і інш.

Рэформы 1860-70-х гг. паклалі пачатак да развіцця капіталістычных адносін ва ўсіх сферах: прамысловасці, сельскай гаспадарцы, транспарце, адукацыі і асвеце. Працэс развіцця капіталізму закрануў сферу кніжнай справы. Выдавецтва кніг пачало пераходзіць да прадпрыймальнікаў. Але наступствы паўстання 1863-1864 гг. мелі адмоўны вынік у развіцці адукацыі і кнігадрукавання на беларускіх землях, што было звязана з закрыццём шэрагу навучальных устаноў на тэрыторыі Беларусі. У разглядаемы перыяд кніга станавілася асноўнай крыніцай распаўсюджвання ведаў і самаадукацыі [1, с. 6 - 8].

Змены ў палітычнай абстаноўцы адлюстроўваліся ў цэнзурнай рэформе. Цэнзурны статут ад 6 красавіка 1865 г. адмяняў папярэднюю цэнзуру для арыгінальных твораў памерам не менш, чым 10 друкаваных аркушаў, а для перакладаў – 20. Выданні меншых памераў павінны былі праходзіць праз папярэднюю цэнзуру, таму што былі больш даступнымі для грамадства.

Царскімі ўладамі былі забаронены выданні ў краі на польска-лацінскім шрыфце. Цыркулярамі М. Мураўёва і К. Каўфмана былі аб'яўлены заброненымі ў краі ўсе польскія выданні, акрамя малітоўнікаў. У 1869 г. былі адменены некаторыя надзвычайныя меры: дазвалялася друкаванне польскіх малітоўнікаў, літаратуры па набажэнстве. У Вільні для нагляду за перыядычнымі выданнямі і літаратурай у краі была ўведзена пасада цэнзара па ўнутранай цэнзуры. Ад папярэдняй цэнзуры вызвалялася толькі літаратура, якая выдавалася праваслаўным духоўным ведамствам. Таксама была ўведзена пасада па знешняй цэнзуры для нагляду за замежнай літаратурай [3, с. 30 - 31].

У азначаны перыяд, з аднаго боку, меры па русіфікацыі і забароне публікацый польска-лацінскім шрыфтам стрымлівалі развіццё беларускага друкаванага слова, але, з другога боку, гэтыя меры спрыялі вяртанню да сваіх вытокаў [4, с. 98]. Выданне кніг на беларускай мове здзяйснялася больш павольнымі тэмпамі, чым на іншых мовах па ўсёй Расійскай Імперыі. З 1861 па 1917 гг. было выдадзена на рускай мове каля 1000 назваў кніг па тэхнічных навуках, прыродазнаўству, медыцыне, сельскай гаспадарцы. У другой палове XIX ст. прыродазнаўчая і тэхнічная літаратура выходзіла толькі ў чатырох павятовых і чатырох губенскіх гарадах Беларусі (Барысаў, Віцебск, Гомель, Гродна, Мінск, Магілёў, Пінск, Полацк). У перыяд з 1901 па 1917 г. выднием навукова-тэхнічых кніг займаліся тыпаграфіі губернскіх і павятовых гарадоў, а таксама іншых населеных пунктаў [1, с. 12 - 15].

У 60 - 80-я гады XIX ст. у мясцовых выдавецтвах Беларусі выходзілі пераважна рэлігійная і багаслоўская літаратура, граматыкі і азбукі, даведнікі, невялікія зборнікі вершаў. Кнігі выдаваліся галоўным чынам на рускай, яўрэйскай і польскай мовах, некалькі кніг у год выходзіла на літоўскай мове. На беларускай мове за гэтыя гады ў краі не было выдадзена ніводнай кнігі.

Рост беларускамоўнага друку звязаны са стварэннем Віленскай археаграфічнай камісіі і Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства. Значным дасягненнем сталі друкаваныя працы даследчыкаў-фалькларыстаў, этнографаў, у якіх даследуецца беларуская мова. Гэта пацвярджаюць працы такіх навукоўцаў, як І. Ярэміч, Я. Карскі, І. Насовіч і інш. Але большасць беларускамоўных тэкстаў была ўключана ў рускамоўныя ці польскамоўныя выданні. Што тычыцца беларускамоўных выданняў лацінкай, неабходна вылучыць творы Ф. Багушэвіча. У Кракаве былі выдадзены такія яго кнігі, як “Смык беларускі”, “Дудка беларуская”, “Тралялёначка”. З сярэдзіны 1890-х да пачатку1900-х гг.у беларускамоўным друку з'яўляюцца брашуры на кірыліцы [4, с. 99 - 100].

Развіццё грамадскай думкі, навукі, культуры ў пачатку XX ст. патрабавала пашырэння выкарыстання кніжных ведаў. Таму назіраецца хуткі рост друкарняў на тэрыторыі краю. Буйнейшымі выдавецкімі цэнтрамі былі Мінск, Віцебск, Магілёў. Сярод мінскіх друкарняў можна вылучыць наступныя: С. Някрасава, Б. Саламонава, І. Каплана, Я. Грынблата і іншых. У пачатку XX ст. друкарні былі створаны ў Бабруйску, Барысаве, Брэсце, Пінску, Рэчыцы, Слуцку. Выдавецкай дзейнасцю займаліся губернскія статыстычныя камітэты.

У пачатку XX ст. пашыраецца кола арганізацый, якія займаюцца выдавецкай дзейнасцю. Значную ролю ў распаўсюджванні асветы і адукацыі адыгралі выданні земскіх органаў. Земствы выдавалі кнігі і брашуры па сельскагаспадарчых пытаннях, медыцыне, адукацыі, эканоміцы, ветэрынарыі.

Выданне кніг па сельскагаспадарчых і лесагаспадарчых пытаннях было выклікана тым, што Беларусь з'яўлялася ў той перыяд сельскагаспадарчым краем. Больш за 20% твораў друку 1901 – 1917 гг. належала да медыцынскіх выданняў. Шмат выданняў было ў галіне тэхнічных навук, што было звязана з развіццём прамысловасці. Новай з'явай для тэхнічнай літаратуры было выданне ў Горках ілюстрыраваных каталогаў земляробчых машын і прылад Горацкага механічнага завода (1904 г.) [2, с. 117 - 123].

Новым у кнігавыдавецкай справе Беларусі стаў выпуск даведчай літаратуры. Напрыклад, даведнікаў, прысвечаных асобным гарадам, слоўнікаў, дапаможнікаў па розных галінах ведаў.

У пачатку ХХ ст. больш увагі надавалася выпуску падручнікаў. Пашыраецца тэматыка такіх выданняў, як вучэбныя дапаможнікі па замежных мовах, прыродазнаўству, міжнароднаму праву.

Павялічваецца колькасць твораў мастацкай літаратуры. З’яўляюцца выданні тыпу альманахаў і зборнікаў (“Туманы”, “Земные сны”, “Струны” і інш.) [2, с. 125 - 126].

Беларускімі студэнтамі ў Пецярбургу была створана культурна-асветніцкая арганізацыя “Круг беларускай народнай прасветы”, якая стала першым беларускім выдавецтвам. У 1903 г. з’явілася іх першае выданне – “Вязанка” Янкі Лучыны. Акрамя легальных выданняў арганізацыя выдавала і два нелегальныя – “Калядная пісанка” і “Велікодная пісанка”. Выдавецкай дзейнасцю займалася і БСГ. Друкаваннем кніг займаліся выдавецтвы "Загляне сонца і ў наша ваконца", “Наша Ніва”, “Гоман”, “Саха” і інш, якія адыгралі значную ролю ў папулярызацыі беларускай кнігі [4, с. 102 - 110].

Новыя змены ў кнігавыданні адбыліся з увядзеннем у дзеянне 24 лістапада 1904 г. “Часовых правіл аб друку”, а 12 снежня 1904 г. быў падпісаны загад аб адмене абмежаванняў у выкарыстанні мясцовых моў у 9 губернях Расійскай Імперыі, у тым ліку і ў беларускіх. Пасля рэвалюцыйных падзей 1905 г. былі прыняты закон аб свабодзе друку (1905 г.), а затым загады аб адмене агульнай і духоўнай цэнзуры (1906 г.), што спрыяла адраджэнню і развіццю беларускамоўнага друку [4, с. 104].

Адставанне ў развіцці кнігадрукавання на беларускай мове звязана перш за ўсё з тым, што царскія ўлады на беларускіх землях перашкаджалі стварэнню тут навучальных і культурных устаноў. Развіццю кнігадрукавання перашкаджалі і іншыя прычыны: адсутнасць навучальных устаноў на роднай мове, вузкі кніжны рынак, нізкая адукаванасць насельніцтва. Таму галоўным культурным цэнтрам Паўночна-Заходняга краю становіцца Вільня. Так, згодна са статыстыкай, ў 1911 г. ва ўсіх беларускіх гарадах выйшла 160 назваў кніг, а ў Вільні – 360 [2, с. 128].

Першай спробай стварэння ў Мінску беларускай выдавецкай арганізацыі стала таварыства “Мінчук”. Арганізацыя ставіла сваёй мэтай выданне і распаўсюджванне кніг і газет, зразумелых малаадукаванаму чытачу. Дзейнасць таварыства пачалася з 1 снежня 1906 г. [4, с. 110].

Працы на беларускай мове друкаваліся ў выглядзе танных брашур. Большая частка кніг прызначалася для малаадукаваных чытачоў, таму яны былі напісаны зразумелай і простай мовай. Беларускія друкарні часта друкавалі адныя і тыя ж кнігі двума шрыфтамі – кірылічным і лацінскім [2, с. 129].

Развіццё адукацыі і прамысловасці спрыялі попыту на кніжную прадукцыю. Пераход кнігавыдавецкай спарвы да прыватных прадпрыймальнікаў абумовіў змяненне характару і тэматыкі кнігавыдання. Друкуюцца даследаванні этнаграфічнага характару, падручнікі, мастацкія творы, кнігі ў галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Беларускае кнігадрукаванне пачатку ХХ ст. спрыяла развіццю нацыянальнай самасвядомасці, навукі і культуры, распаўсюджванню адукацыі і асветы.

**Літаратура**


1. Березкина, Н.Ю. Роль печати в распространении научных знаний в Белоруссии, 1861 – 1917 гг. / Н.Ю. Березкина. – Минск : Навука і тэхніка, 1990. – 112 с. : ил.
2. Бярозкіна, Н.Ю. Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.) / Н.Ю. Бярозкіна.– Мінск : Беларуская навука, 1998. – 199 с. : іл.
3. Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму: вучэб. дапам.: у 5 ч. / Склад. А.П. Жытко [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2005 – 2009. – Ч. 4: Буржуазныя рэформы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. – 2009. – 165 с.
4. Доўнар Л.І. Гісторыя беларускай кнігі : вучэб. дапам. / Л.І.Доўнар. – Мінск : БДУКМ, 2012. – 252 с.